ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
28
КРАСАВІКА
№ 14 (1572)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## У наступным нумары чытайце

Недарэмна сцвярджаюць, што студэнцкія сем'і — самыя моцныя, маючы на ўвазе тыя абставіны, што толькі ў сумесным пераадоленні цяжкасцей і складанасцей можна праверыць глыбіню і сілу пачуцця, правільнасць выбару і нават уласную зрэласць, падрыхтаванасць да вялікага жыцця, здольнасць дзяліць са Сваім Чалавекам і радасць, і сум. І, на жаль, нячаста можна пачуць, што на самай справе стаіць за гэтым прывабным выразам: «студэнцкія сем'і — самыя моцныя».

ПРА ГЭТА ЧЫТАЙЦЕ Ў НАШЫМ НАСТУПНЫМ НУМАРЫ.

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### ПЫТАННІ УЗАЕМАВЫГАДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

ў галіне навукі былі абмеркаваны ў час візіту ва універсітэт амерыканскай дэлегацыі, якая прыехала ў Савецкі Саюз па запрашэнню Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі. У саставе дэлегацыі — прэзідэнт асацыяцыі дзяржаўных універсітэтаў і коледжаў США Ален Остэр і рэктары некаторых універсітэтаў і коледжаў.

Госці сустрэліся з кіраўніцтвам БДУ імя У. І. Леніна, пабывалі на днях фізфака, азнаёміліся з лабараторыямі факультэта, а таксама з умовамі пражывання студэнтаў у інтэрнаце № 8.

Традыцыйны маршрут — Хатынь і Курган Славы.

З. МІХНЕВІЧ.

•

### НЕ ТОЛЬКІ ЯКАСЦЬ

падрыхтоўкі спецыялістаў хвалюе членаў вучонага савета БДУ імя У. І. Леніна, хоць гэта, безумоўна, адно з асноўных пытанняў. Вялікая ўвага надаецца і развіццю масавай фізічнай культуры і спорту. На апошнім пасяджэнні савета было выказана шмат заўваг і адзначаны шэраг недахопаў у гэтай важнай справе, а таксама вызначаны шляхі іх пераадолення.

А. МАРОЗАЎ.

•

### ТРАДЫЦЫЙНАЯ ЭСТАФЕТА

па г. Мінску, прысвечаная 118-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, фінішавала. У ёй прымалі ўдзел студэнты ВНУ, навучэнцы тэхнікумаў, ГПТВ, школ, а таксама прадстаўнікі вытворчых калектываў. Сярод ВНУ першае месца прысуджана ІФК, другое — БДУ імя У. І. Леніна, трэцяе — БДІНГ.

Д. ВІЛЬКІН.

•

### «ТРОХКУТНЫ РЫНГ»

адбудзецца ў літаратурнай гасцёўні філалагічнага факультэта (вул. Чырвонаармейская, 6), у якім прымуць удзел супрацоўнікі часопіса «Крыніца» і універсітэцкае літаб'яднанне «Узлёт». На пытанні прысутных адкажуць паэты Уладзімір Някляеў, Адам Глобус, празаік Алесь Асташонак, крытык Анатоль Сідарэвіч, журналісты Леанід Екель, Павел Якубовіч, Міхась Кацюшэнка і іншыя.

Усіх жадаючых чакаем 4 мая а 19-й гадзіне ў актавай зале філалагічнага факультэта.

А. БАДАК.

Якім уяўляла сабе Нучарынт Савецкі Саюз? І ці марыла калі-небудзь, што давядзецца вучыцца ў невядомай раней Беларусі? Але жыццё павярнула ўсё так, што менавіта ёй выпала такое шчасце. Зараз цікавяць яе не толькі заняткі, але і ўсё тое, што адбываецца ў нашай краіне. Праз тры гады прыедзе яна дадому, будзе вучыць дзяцей разумнаму, добраму, вечнаму, і веданне жыцця першай краіны сацыялізму вельмі спатрэбіцца ёй.

НА ЗДЫМКУ: Нучарынт Руджыратварангул (Таіланд), студэнтка 2 курса філфака.

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

## Ідэалы ў нас адзіныя

ЗАСТАЛОСЯ некалькі дзён да таго, калі ўсё прагрэсіўнае чалавецтва, усе працоўныя свету будуць святкаваць 1 Мая!

Пра знамянальныя майскія стачкі, якія адбываліся яшчэ ў мінулым стагоддзі, беднае кангалезскае сялянства даведацца змагло пазней, бо знаходзілася ў поўнай каланіяльнай ізаляцыі. Але мацнеў нацыянальна-вызваленчы рух у краіне, паступова фарміраваўся рабочы клас і пасля абвяшчэння незалежнасці Кангалезскі прафсаюз пачаў арганізоўваць працу па выхаванню працоўных у духу міру і інтэрнацыяналізму. І зараз, у вельмі цяжкіх міжнародных абставінах ён застаецца верным камуністычным ідэалам і ў гэты святочны першамайскі дзень будзе адзначаць сваю 25-ую гадавіну.

Мінула ўжо некалькі гадоў з тае пары, як кангалезскі народ вырашыў ісці па шляху сацыялістычнай арыентацыі... Сёння ў нашай краіне ўсе сілы мабілізаваны на будаўніцтва новага грамадства. Кіруючую ролю ў барацьбе за новы свет адыгрывае Кангалезскі прафсаюз, які вядзе актыўную прапагандысцкую работу, распаўсюджвае сярод працоўных ідэі марксізму-ленінізму і пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Шарль МАЙЕКУ,
студэнт аддзялення
міжнароднай журналістыкі.

ДЛЯ ВАС

## Паспрабуем?

У МЭТАХ актывізацыі прапаганды ленінскіх ідэй захавання гісторыка-культурнай спадчыны нашага народа, выхавання пачуцця савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, павагі да працы і таленту народа, прыцягнення шырокіх слаёў насельніцтва да актыўнага і непасрэднага ўдзелу ў ахове помнікаў прэзідыум Рэспубліканскага савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і Сакратарыят праўлення Саюза журналістаў Беларускай ССР з 1 студзеня да 1 снежня 1988 года праводзіць рэспубліканскі творчы конкурс на лепшае асвятленне ў друку, па тэлебачанню і радыё пытанняў аховы, выкарыстання і прапаганды помнікаў гісторыі і культуры, прысвечаны 70-годдзю ўтварэння БССР і Кампартыі Беларусі.

Конкурс праводзіцца для рэдакцый рэспубліканскіх, абласных, аб'яднаных, гарадскіх, раённых і шматтыражных газет і часопісаў. У ІМ МОГУЦЬ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ АСОБНЫЯ АЎТАРЫ.

Установлены грашовыя прэміі.

Для рэдакцый шматтыражных газет:
першая — 150 рублёў
другая — 100 рублёў
трэцяя — 75 рублёў.

ДЛЯ АСОБНЫХ АЎТАРАЎ:
першая — 100 рублёў
другая — 75 рублёў
трэцяя — 50 рублёў.

Запрашаем усіх жадаючых да ўдзелу ў конкурсе.

РОЗДУМ НАД ФАКТАМ

## «ХАЧУ» ПАТРАБУЕ КАНТРОЛЮ

КАЛІ ўзяць яго ў ідэальнай абстракцыі, то вольнае наведванне не толькі патрэбна—нават неабходна. Тут галоўную ролю адыгрывае перш за ўсё свабода выбару.

Між іншым, мы на сваім аддзяленні правялі сацыялагічнае апытанне. Аказалася, што большасць студэнтаў супраць вольнага наведвання на першым курсе. Аб чым гэта гаворыць? Учарашні школьнік, які на працягу дзесяці гадоў знаходзіўся пад пастаянным кантролем педагогаў, асноўнай формулай якіх было «трэба», безумоўна, атрымаўшы свабоду, не зможа сувымераць сваё «хачу» з грамадскім «трэба».

Вольнае наведванне дае чалавеку права самастойнага выбару. Гэта вельмі важна. Гэта прывучае яго да самастойнасці і нестэрэатыпнага рашэння. Ён сам плануе свой час. Але ёсць людзі, якія яшчэ не навучыліся пераадольваць сябе, ім цяжка прымусіць сябе нешта зрабіць, і тут фактар арганізуючай сістэмы адыгрывае вялікую ролю. Ён ратуе іх ад лодырнічання, залішніх захапленняў і г. д.

Вы можаце запярэчыць мне: «Той, хто не можа прымусіць сябе займацца ці яму гэта нецікава — проста не на сваім месцы». Я думаю не так. Па-першае, не ўсе таленавітыя людзі па розных прычынах могуць арганізаваць сябе, а па-другое, захапленне выбранай справай не заўсёды прыходзіць адразу. Мы маем магчымасць назіраць такі феномен: старшакурснікі, асвоіўшы ўжо большую частку вучэбнай праграмы, адносяцца да сваёй спецыяльнасці з большай цікавасцю, чым студэнты малодшых курсаў. Гэта можна ў нейкай ступені растлумачыць тым, што на першых курсах перавага аддаецца засваенню так званых «класічных» дысцыплін, і магчымасць творчай навуковай работы пакуль абмежавана яшчэ вузкімі рамкамі ведаў.

Амаль усе студэнты былі супраць вольнага наведвання семінарскіх заняткаў. Было прапанавана зрабіць іх радзей, магчыма нават задаволіцца адным калёквіумам у месяц па кожнаму прадмету, але ўсё ж іх павінны наведваць усе. Між іншым, у мэтазгоднасці такога рашэння нас пераконвае практыка лепшых еўрапейскіх і амерыканскіх універсітэтаў. Лічу, што выкладчык усё ж павінен бачыць кожнага студэнта ў працэсе творчага мыслення.

І яшчэ адзін момант. Калі мы хочам увесці вольнае наведванне, то мы павінны мяняць псіхалогію не толькі студэнта, але і выкладчыка. Таму што не кожны педагог можа справядліва прызнацца сабе, што ён аднолькава адносіцца і да студэнта, які не наведвае лекцыі, і да таго, які прысутнічае заўсёды. Трэба прывучацца быць аб'ектыўным, і аддача ад студэнтаў абавязкова будзе.

Запаветная мара многіх маіх сяброў — вольнае наведванне — для мяне існуе ў рэчаіснасці. Але цяпер я чамусьці прапускаю лекцый менш, чым раней, калі дзеянне нараджала супрацьдзеянне. Толькі цяпер я ўсвядоміла неабходнасць добра прачытаных лекцый. Я маю права выбару: ісці на лекцыю ці сядзець у бібліятэцы. Я іду! Бо сапраўдны лектар лепей за выдатнейшы падручнік.

Я «за» вольнае наведванне ў сэнсе магчымасці выбару. Тады будзе відно, якія лекцыі карыстаюцца аўтарытэтам. Магчыма, гэта стане ў нейкай ступені стымулам для выкладчыкаў. А студэнты нарэшце зразумеюць, што вышэйшая адукацыя не чарговы падарунак з шырокай дзяржаўнай кішэні.

Н. АБЛАВАЦКАЯ,
студэнтка філасофскага
аддзялення гістфака.

ЗАРАЗ, напэўна, цяжка знайсці чалавека, якога б не цікавілі кнігі. Але набыць тое ці іншае выданне не заўсёды проста, асабліва калі яно карыстаецца папулярнасцю. Калі вы марыце аб тым, каб на вашай кніжнай паліцы стаяў твор любімага паэта ці пісьменніка, знайдзіце час і абавязкова наведайце усесаюзнае свята «Дзень букіністычнай кнігі», якое адбудзецца ў Мінску ў Дзень друку — 5 мая.

## Прадоўжыць жыццё кнігі

У гэты дзень букіністы горада правядуць кніжныя базары на плошчы Я. Коласа (ля Белдзяржфілармоніі), на плошчы ля Палаца культуры чыгуначнікаў і ў скверы ля Палаца культуры трактарнага завода. Тут будзе шырока прадстаўлена мастацкая літаратура (творы рускай і замежнай класікі, сучасных аўтараў, кнігі беларускіх пісьменнікаў), выданні па мастацтву, а таксама грамадска-палітычная, вучэбная і навукова-тэхнічная літаратура. На плошчы Я. Коласа будзе працаваць таксама выстаўка рэдкіх і антыкварных выданняў.

На «Днях букіністычнай кнігі» вы зможаце выкарыстаць паслугі кнігаабмену і здаць літаратуру, якая карыстаецца попытам, аформіць заказы на кнігі мінулых гадоў выдання і атрымаць кансультацыю па пытаннях букіністычнага гандлю.

ДЛЯ ДАВЕДКІ: БУКІНІСТЫЧНЫЯ КНІЖНЫЯ БАЗАРЫ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ З 12 ДА 18 ГАДЗІН.

С. ДАШЧЫНСКАЯ,
рэдактар аддзела
прапаганды кнігі Мінаблкнігагандлю.

Чуткі паўзлі па універсітэту.

— Аб часовай перастаноўцы слагаемых,— з таямнічым відам паведаміў старшакурснік. І пашыбаваў у бібліятэку рыхтавацца да першай самастойнай лекцыі.

— Хіба так цяжка кіраваць студэнтамі? — не згадзіўся першакурснік. І накіраваўся да крэсла дэкана.

— Паглядзім, як у вас атрымаецца,— з добрай іроніяй уздыхнулі выкладчыкі. І пацяснілася, уступаючы месца ў вучоным савеце.

Не такое яно і ўтульнае, гэта кіраўніцкае крэсла, як падалося, калі апынуўся ў ім на дзень. Праблемы, цяжкасці, складанасці. Аб іх гаворка ў сённяшнім спецвыпуску.

*Вясці не дапамагалі: на скрыжаванні меркаванняў З. АЛЯШКЕВІЧ, у дэканаце — А. КОКТЫШ, у сацыялагічнай лабараторыі — В. ЛАКЛОНСКАЯ, на студэнцкай галерэі — В. БЯГУН, у інтэрнаце — А. МАКСІМАЎ.*

# УСЯ ЎЛАДА — САМАКІРАВАННЮ!?




Цяжка вызначыць дакладна функцыі студэнцкага самакіравання, не закранаючы яго змест на кожным канкрэтным факультэце. У студэнтаў факультэта радыёфізікі і электронікі погляды на гэту з'яву самыя разнастайныя, нават супрацьлеглыя. Пытанне: «Як адносіцца да самакіравання?» прагучала не адзін раз. Некаторыя ў адказ на яго проста пасміхаліся. На дапамогу прыйшоў дэкан Аляксандр Міхайлавіч Шырокаў.

ВАЧЫМА ДЭКАНА

## «Я супраць дробязей»

— Прайшоўшы шлях ад аўдыторыі да крэсла дэкана, добра магу зразумець студэнта і дацэнта, аспіранта і загадчыка кафедры. Тое, што самакіраванне ўспрымаецца часам скептычна як студэнтамі, так і выкладчыкамі,— вынік таго, што спроба наладзіць яго ўжо неаднойчы была. І не атрымалася. Адсюль і пэўны скептыцызм.

Галоўнае, я лічу, у самакіраванні — гэта галоснасць. Студэнты павінны ведаць, што робіцца ў дэканаце, рэктараце, супрацоўнікі якіх павінны агледаць студэнцкую аўдыторыю не толькі поглядам выкладчыка. Тады справа будзе АГУЛЬНАЙ. Прапанаваную такую схему ўзаемаадносін: «Вопыт і веды — азарту і маладым сілам, юнацкую няўрымслівасць і задзірыстасць — вучонай сталасці». Здаецца, такі сінтэз ужо існуе ва універсітэцкім і факультэцкіх саветах.

У чым жа яно праўляецца, гэта самакіраванне?

Уся ўлада пры размеркаванні стыпендый належыць студэнтам, якія складаюць 90 працэнтаў стыпендыяльнай камісіі. Нават такая справа, як адбор абітурыентаў на факультэт радыёфізікі і электронікі без іх удзелу не абыходзіцца. Калі раней быў у мяне так званы фонд дэкана: тры стыпендыі і тры месцы ў інтэрнаце на ўсякі выпадак — сёння студэнцкая ўлада ралічэнне таго, што атрымалі студэнты, займае ледзь не ўвесь ліст. Але самакіраванне — гэта перш за ўсё абавязкі, а потым правы.

Добра, што студэнты ўдзельнічаюць у пасяджэннях стыпендыяльнай камісіі. Добра, што маюць права заахвочваць актывістаў. Добра, што нават размеркаванне на месца работы праводзяць самастойна. Добра, што... Толькі возьмем канкрэтны прыклад з жыцця. Вось Міраслаў Сакалоў — рэдактар газеты, ён жа майстак, ён жа аўтар усіх матэрыялаў, ён жа карэктар, ён жа... Увасабляе ў сабе ўсе тыя здольнасці, якія павінны належаць цэлай рэдкалегіі. За вучобны год газета выйшла толькі што два разы. Усім спадабалася, усе чакаюць наступнага нумара. У тым лік дэканат, партком, камітэт камсамола, прафком, чыім органам газета з яўляецца.

Нават у культурна-масавай рабоце здараюцца правалы. Пажадалі студэнты правесці ў свежні конкурс мастацкай самадзейнасці. Не атрымалася. Перанеслі на сакавік. І нешта маўчаць. І так будзе да тае пары, пакуль працуе на факультэце адна групка людзей пад назвай «аргкамітэт». Астатнія з вялікім задавальненнем прыходзяць паглядзець і ўзнагарыцца: «Вось мы «далі» на справе не мы, атрымліваецца, а той «нехта», які малюе газеты, арганізоўвае святочныя канцэрты, каму больш за ўсіх трэба. Мабыць, многія яшчэ не дарасліі.

У самакіраванні не можа быць дробязей. І нагогул, ці існуюць дробязі для дваццацігадовага юнака ці дзяўчыны, для якіх жыццё — студэнцкія гады. Мы звыклі з «адабрамамі» усяго, што вакол нас. Я галасую «супраць» хвалебных рапартаў аб поўным самакіраванні, але і супраць старэчага бурчання выкладчыкаў, што молядзь зараз нічым не здзівіш.

Толькі прапаную студэнтам зірнуць на сябе і адказаць шчыра на пытанне: «А я самастойны?»

КАР. Мне таксама хацелася б закончыць інтэрв'ю пытаннем да студэнтаў.

Першая група трэцяга курса факультэта радыёфізікі і электронікі прыпускае ўсім саставам заняткі па палітэканоміі. Сумняваюся, што менавіта ў гэтым заключаецца самакіраванне. Вы не згодны?

Мабыць, трэба было б спачатку пазнаёміцца з вынікамі анкеты «Выкладчык вачыма студэнта» у дэканаце якога-небудзь факультэта, каб даведацца, колькі выкладчыкаў звольнена, колькі змянілі свае педагагічныя ці навуковыя метады і прынцыпы ў выніку апытання студэнтаў. Але нешта перашкаджала мне пайсці за такімі звесткамі. Што — я зразумела, калі адчула сябе працаўнікам гэтых анкет, нават самога іх з'яўлення ў нашым студэнцкім жыцці.

Не, я памятаю, безумоўна, што яны — яскравае праяўленне дэмакратыі і студэнцкага самакіравання: студэнт увесь час адчуваў сябе ў параўнанні з выкладчыкам слабым, ведаў, што хутка можа папікадаваць аб любым учынку супрацьлектара. І нездарма: залікі, экзамены, навуковыя работы — вось яно, поле для пакарання. Цяпер жа — калі ласка, і ты маеш права на пакаранне выкладчыка. Ці на аб'ектыўную ацэнку яго працы?

У кожным нашым дзеянні, у кожнай справе ёсць маральны бок, бо любой нітачкай нашых думак і ўчынкаў мы звязаны з іншымі людзьмі. Не абысціся без маральнага падтэксту і ў гаворцы пра анкету «Выкладчык вачыма студэнта».

Самае першае, самае простае пытанне: ці маем права? Вось ён стаіць перад намі за кафедрай, выкладчык. Можа, ён зусім і не цікавіцца нашымі адносінамі да сваёй працы, можа, не вельмі стараецца данесці нешта значнае да нашых канспектаў і сядомасці, можа, даўно не рыхтаваўся да сваіх лекцый. І нагогул, ён дрэнны чалавек, дрэнны, і ўсё. Але якія мы самі — тыя, хто бярэцца выносіць такі прыгавор?

Я, не скончыўшы трэцяга курса, ужо слухала выкладчыкаў, словы якіх калі і выклікаюць увагу, дык у выглядзе абурэння, якіх не хацелася паважаць, нават калі матэрыял лекцыі даносіўся на высокім прафесійным узроўні. Але і ў гэтым выпадку не ўяўляю, як можна сказаць чалавеку: «Вы набралі мінімальную колькасць балаў па выніках анкет, распаўсюджаных сярод вашых студэнтаў...»

Нават калі і ёсць праўда ў такой заяве, наўрад ці згодзіцца ён з ёй чалавек, якога яна датычыць: ён дабіўся права выкладаць ва універсітэце і такі вынік апытання прыме як катэгарычны і неабгрунтаваны.

Прыгадаеце студэнтаў, калі атрымана ў час экзамена, на іх думку, неаб'ектыўная адзнака.

А цяпер уявіце сабе выкладчыка, які, даведаўшыся аб выніках анкетавання, пачынае над сабой працаваць, як быццам зразумеўшы нешта значнае. Мне здаецца, блізкія да рэчаіснасці іншыя сітуацыі — калі студэнтаў просяць паўторна запоўніць анкету на выкладчыка, які атрымаў малую колькасць балаў. Ці не здаралася такое ў вашай групе?

Наогул цяжка ўявіць форму, у якой можна было б перадаць выкладчыку адмоўныя студэнцкія меркаванні аб прафесійных і асабістых якасцях. Вынікі нашых анкет не лепшы варыянт для такой перадачы. Перш за ўсё — з-за зместу самых анкет.

Можна знайсці недарэчнасці ў кожным пункце. Толькі некалькі прыкладаў. Як можа аднесціся сярэдні студэнт да такога крытэрыю ў ацэнцы выкладчыка — патрабавальнасць? Згадзіцеся, мы звычайна чакаем да сябе лаяльнасці, а не патрабавальнасці. І калі пішам у анкеце 9 балаў выкладчыку за тое, што ён праяўляе патрабавальнасць «практычна заўсёды», наўрад ці ставімся да гэтай ацэнкі як станоўчай, але ў выніку балаў набіраецца больш — што «сведчыць аб пазітыўным меркаванні».

Вось пункты, вельмі падобныя паміж сабой: № 12 — добразычлівасць і такт у адносінах да студэнтаў і № 17 — паважлівыя адносіны да студэнтаў. І яшчэ — «зацікаўленасць у поспехах студэнтаў» (№ 15), ці ўжо нешта зусім дзіўнае — «выключае прыхільнасць да сябе высокай эрудыцыяй, манерай паводзін, знешнім выглядам» (цікава, чым можна аб'яднаць знешні выгляд і эрудыцыю?). Усе пералічаныя крытэрыі парушаюць аб'ектыўнасць нашай ацэнкі выкладчыку, бо вельмі балюча закранаюць яны нашы асабістыя інтарэсы: калі мы атрымліваем «пасрэдна», а чакалі «добра», то хутчэй за ўсё добразычлівасці і паважлівасці выкладчыка не адзначым. Успомніце, яшчэ ў школе мы часта абвінавачвалі настаўніка ў неаб'ектыўнасці — «навошта ён мне ўчора «пару» уляпіў?»

А цяпер пра сістэму балаў. Вельмі цяжка пры ацэнцы канкрэтнага чалавека дакладна разабрацца, праяўляюцца ці не праяўляюцца ў ім тыя ці іншыя якасці. Ці можна ў адзнаку ўключаць і такія, якія не праяўляюцца ў дадзены момант, але могуць праявіцца ў будучыні? Ці можна ацэньваць выкладчыка, які ў гэты момант не ў форме, не ў настроі, не ў стане? Ці можна ацэньваць выкладчыка, які ў гэты момант не ў форме, не ў настроі, не ў стане?

ТВОЙ СУЧАСНІК

# Башар абвяргае інструкцыі

— ДОЎГІ час цікавіла мяне ваша краіна,— прызнаецца студэнт аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта Башар Браім.

Настаўнік, які выкладаў у ліцэі хімію і фізіку, неаднойчы расказваў вучням аб Савецкім Саюзе. Мне здаецца, вельмі цікава расказваў: невыпадкова ж месцам сваёй далейшай вучобы Браім абраў нашу краіну. Дарэчы, да ад'езду ён атрымаў некалькі «клапатлівых» інструкцый. «Рускія замкнутыя, панурыя, нетаварыскія»,— нашэптвалі яны. І быццам бы між іншым паміж радкоў гучала: «Калі набярэшся ад іх «чырвонага колеру» — лепей не вяртайся».

Апынуўшыся ў нашай краіне, Башар спачатку прыглядваўся да людзей, імкнучыся зразумець іх, пазнаць бліжэй. Якая ж рыса з'яўляецца больш характэрнай? Па меркаванню Башара, працавітасць.

— Як можна столькі працаваць? — шчыра здзіўляецца ён.

Найвялікшай цяжкасцю для яго з'явілася вывучэнне рускай мовы. Калі прыехаў у СССР у 1982 годзе, не ведаў па-руску ніводнага слова. Выратоўвалі, праўда, жэсты. Але і зараз, лічыць Браім:

— Колькі б ні вывучаў замежнік гэтую мілагучную мову, ніколі з цвёрдай упэўненасцю не зможа ён сказаць, што ведае яе дасканала.

Як вядома, галоўнае ў вывучэнні кожнай мовы—практыка. Недахопу ў субяседніках Башар не адчувае. Магчыма, таму, што сам ён — чалавек таварыскі і сяброўскімі адносінамі даражыць умее. Сапраўдны сябар толькі той, каму можна даверыць самае патаемнае. Такія сябры засталіся ў яго на радзіме, у Чадзе, паявіліся за час вучобы і тут.

Сам Башар лічыць сябе аптымістам. Магчыма, і Пушкіна палюбіў за жыццесцвярджальнае гучанне радкоў яго вершаў. Дарэчы, паэзія, як і тэатр (Башар нават займаецца ў маладзёжнай студыі пры Палацы чыгуначнікаў), яго захапленні.

Есць і яшчэ адно. Самае сур'ёзнае. Башар пастаянны ўдзельнік дыскусій клуба «Палітыкус». Заўсёды падрыхтаваны да заняткаў, ён, як ніхто, умее абагульняць, рабіць правільныя вывады. Веданне вучэбных дысцыплін дапамагае яму задаваць пытанні такія пранікальныя ў сутнасць прадмета, што застаецца толькі здзіўляцца, дзе знаходзіць ён інфармацыю, на якую многія студэнты не звярнулі б увагі.

Бывае, для таго, каб пазбавіцца ад павуціння штодзённасці, патрэбны чалавеку новыя ўражанні. Тады разам з сябрамі Башар збіраецца ў чарговае падарожжа. Гэта, калі хочаце, таксама адна з задач яго прабывання ў Савецкім Саюзе — многае ўбачыць, пра многае даведацца, каб ніколі не верылі яго суайчыннікі «інструкцыям», пачуўшы жывое слова.

Тым, хто ведае Башара Браіма, цяжка ўявіць сабе яго без адкрытай шчырай усмешкі. Але не толькі гэта адрознівае яго ад іншых. Не так часта сустракаюцца нам людзі спагадлівыя, якія жывуць жаданнем дапамагчы.

М. ПАПОВА.

ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

# Амерыка, якую мы адкрывалі

ЦЯПЕР Я УМЕЮ вітацца за руку. Так, каб поціск рукі быў моцны, але сустрэчны не адчуваў болю. Гэтаму навучыў мяне Кевін Брэннан Клоўз, студэнт Гарвардскага універсітэта, што ў штаце Масачусетс.

З Брэннанам і яго суайчыннікамі Кетрын Бойл і Джэммі Гоферман я пазнаёмілася ў час савецка-амерыканскай дыскусіі, якая праходзіла дваццатага красавіка ва універсітэце. Тэма дыскусіі — «Якімі павінны быць адносіны паміж сродкамі масавай інфармацыі і ўрадам у сучасным свеце?» З савецкага боку выступалі выпускнік гістфака УЛАДЗІМІР СЕМЯНЬКОЎ, мой аднакурснік ІГАР ШАЎЧУК і я.

Акрамя нумара «Знамёнкі» з расказам аб дыскусіі і амерыканскіх сувеніраў, захавалася шмат разнастайных уражанняў. Хачу падзяліцца імі і прапаную вашай увазе аўтаінтэрв'ю. Каб не выглядала яно як бессаромная самарэклама, папярэджваю: задаю сабе толькі тыя пытанні, якія пачула ад сваіх аднакурснікаў на наступны дзень пасля сустрэчы.

— Як лічыш, не вельмі сумавалі гледачы, назіраючы за вашымі «перагаворамі»?

— Ва ўсякім выпадку, калі б не сядзела на сцэне, то паслухаць тых, хто дэбатаваў, я прыйшла б абавязкова. Можна было параўнаць амерыканскую і савецкую мадэлі свабоды друку і яго ўдзелу ў справах дзяржавы. А ўважліва прыгледзеўшыся, нават улавіць некаторыя адрозненні «іх» і «нашага» складу думак.

Пэўна, выявіліся нашы ўзаемныя прадузятасці, але і такое ж узаемнае жаданне пераадолець стэрэатыпы. А калі дэбаты здаліся сумнымі, засталася ж магчымасць «неформальнай» гутаркі з гасцямі.

— Гэта праўда, што захапленні амерыканскіх студэнтаў вельмі падобны да нашых?

— Так. Джэммі любіць музыку Чайкоўскага і Рахманінава. Брэннан нярэдка слухае Акуджаву і Высоцкага. Мы чытаем Хемінгуэя і Уайльда і марым дагнаць амерыканскія універсітэты па ўзроўню развіцця сістэмы вольнага наведвання. Нам падабаецца спрачацца і падарожнічаць, мы ўсе разам за дэмакратыю і прагрэс. Хоць часам разумеем гэтыя паняцці па-рознаму.

— Гавораць, гасцям апладзіравалі больш, чым гаспадарам...

— Паверу. Госці вялі сябе больш свабодна і былі больш дасціпнымі. Наогул, я б назвала іх майстрамі выступленняў перад аўдыторыяй. І не дзіўна — усе яны члены Асацыяцыі прамоўніцкага майстэрства ЗША, займаюцца з вядомымі спецыялістамі, удасканальваючы сваё ўменне даказваць і заваёўваць давер. У нас жа словы «прамоўніцкае майстэрства» выклікалі, на жаль, толькі ўспаміны аб антычнасці.

— Паслухай, а навошта вам гэта патрэбна? Амерыканскія студэнты, пэўна, вучыліся праводзіць будучую перадвыбарную кампанію. А вы?

— Але ж мы жывём у краіне, дзе дэмакратыя пастаянна развіваецца. Магчыма, уласнай перадвыбарнай кампаніі ў кожнага з нас не будзе, толькі выступаць на сходах, дамагацца прыняцця рашэнняў, якія лічым больш правільнымі, нам абавязкова давядзецца. Да таго ж, у гутарцы даведаліся пра многае.

— Хто ж атрымаў перамогу?

— Пераможцаў мы не вызначылі. Дыскусія пачалася і закончылася пажаданнямі міру і супрацоўніцтва. Кожны са слухачоў зрабіў свае ўласныя вывады. Брэннан на наступны дзень заўважыў, што на гэты раз мы разумелі адзін аднаго лепш за нашых папярэднікаў. Так што перамогу атрымала ўзаемаразуменне.

М. КУНОЎСКАЯ,
удзельніца дыскусіі.

СПАДЧЫНА

# З НАРОДАМ І Ў НАРОДЗЕ

**Беларуская народная песня... Каго з нас не зачароўвала знаёмая з дзяцінства мелодыя, шчырыя і задушэўныя словы! Трапяткая і віхурыста-адчайная, задуменная і імклівая, спакойная і задзірыстая, журботная і рашучая — народная песня была і хлебам, і душэўнай асалодай народа. Не часта пачуеш яе цяпер на вёсцы, рэдкім госцем бывае яна пакуль што на гарадскіх сцэнах. Аднак яна не здаецца, шукае і знаходзіць дарогу да шырокага слухача. Есць у яе і верныя сябры.**

Актавая зала філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, бадай, ніколі яшчэ не ўзрывалася такім громам апладысментаў. Хлебам-соллю на вышываным беларускім ручніку сустракалі будучыя настаўнікі-славеснікі заслужаную артыстку БССР Валянціну Пархоменка і яе вернага спадарожніка Аляксандра Казака. Ініцыятарам сустрэчы стала кафедра беларускай мовы, яе партгрупорг дацэнт Н. І. Гілевіч.

...Духмяным водарам палескіх лугоў і ніў, вірлівымі ручаямі Гродзеншчыны і Полаччыны, жыццёвай мудрасцю часу і дасціпным перазовам маладосці веела ад добра знаёмых і зусім невядомых песень. Моцны, па-народнаму натуральны голас артысткі тварыў цуды. Валянціна Васільеўна не толькі спявала, але і каменціравала кожны твор, расказвала пра бытаванне яго ў Беларусі, спынялася на асаблівасцях выканання ў розных рэгіёнах. Даведаліся слухачы і аб тым, як беларуская народная песня ў выкананні В. Пархоменка перамагла ў вочным спаборніцтве з папулярнай амерыканскай джазавай спявачкай у штаце Мічыган. Адметным выкананнем «мужчынскіх» песень, выдатнай ігрой на гармоніку парадаваў слухачоў і Аляксандр Казак.

Вядомы літаратуразнаўца і паэт, прафесар Алег Лойка заўважыў пасля канцэрта, што такая сустрэча дае студэнту ў дзесяць разоў больш, чым любая лекцыя. Не пагадзіцца з гэтым цяжка. Беззапаветная любоў да роднай песні, мілагучная беларуская мова, якой свабодна і натуральна валодаюць артысты, шчырасць і сардэчнасць думак і разваг на працягу амаль дзвюх гадзін сустрэчы-канцэрта — усё гэта знайшло самы гарачы водгук. Зацікавіліся спявачкай і супрацоўнікі навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору і дыялекталогіі, якія прапанавалі для яе рэпертуару некалькі невядомых мелодый народных песень, запісаных у розных кутках Беларусі. Несумненна, такое супрацоўніцтва артысткі і фальклярыстаў узбагаціць беларускую нацыянальную культуру новымі творамі, далучыць да народнага мастацтва новых выканаўцаў, шчырых сяброў багатай песеннай спадчыны беларускага народа.

М. ПРЫГОДЗІЧ,
дацэнт кафедры беларускай мовы філалагічнага факультэта.

ПАЧЫНАЕЦЦА З ПАДРЫХТОЎЧАГА

# ДОМ НА ШЭСЦЬ ГАДОЎ

Перш, чым пачынаць вучобу па выбранай спецыяльнасці, кожны з іх вывучае рускую мову. Без гэтага нельга. Не зможаш ні авалодаць азамі хіміі, фізікі, чарчэння (для тых, хто не мае сярэдняй адукацыі), ні займацца матэматыкай. Таму што ўсе студэнты, а на гэтым факультэце іх 260,— замежнікі. Каб ведаць краіну, якая стала домам на шэсць гадоў, цікавяцца яны гісторыяй Савецкай дзяржавы, яе законамі, знешняй і ўнутранай палітыкай партыі. А закончыўшы «падрыхтоўчы» год, працягваюць вучобу ў ВНУ нашай краіны.

ГАТТАН Рызк прыехаў да нас з Лівана. У марах бачыў ён сябе ўрачом, а трапіў у Мінск, дзе няма падрыхтоўчага аддзялення па данай спецыяльнасці. Перавесціся на другі факультэт вельмі складана. Што ж было рабіць? Заняцца нелюбімай справай? Ці наогул кінуць вучобу? Рэгіна Іосіфаўна Кавалёва, выкладчыца факультэта, дапамагла знайсці іншае выйсце. Цяпер Гаттан вучыцца ў Вінніцы. І часта дасылае лісты былой выкладчыцы, прыязджае ў госці да сяброў.

— Адкрыйце тэксты. Што, магчыма, не зразумелі ў дамашнім заданні?

Такімі словамі пачынаюцца заняткі па канструкцыі навуковага мыслення. Размаўляць на рускай мове яшчэ цяжкавата, але ад гэтага колькасць жадаючых адказаць на пытанне не памяншаецца — актыўна працуюць усе.

— Чый адказ вам больш падабаецца: Савіа ці Эсэра?
— цікавіцца Рэгіна Іосіфаўна.
— А як лічыце вы? — паспрабаваў схітраваць Валід.

— Добра адказвалі абодва,
— дапамагае сябрам Айман,
Так, вучацца тут не толькі выдатна адказваць, але і падводзіць вынікі.

Замежныя студэнты прыязджаюць сюды з краін з розным палітычным ладам. Але гэта не перашкаджае ім знаходзіцца ў добрых адносінах. У групе, дзе я пабывала, сябруюць студэнты з Сірыі, Палесціны, Лівана. Усе яны адчуваюць сябе на падрыхтоўчым факультэце, як дома. Так і павінна быць. Дзеля гэтага працуюць з душой выкладчыкі факультэта.

М. ЯМНАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
28 красавіка
Зак. 1620.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М.Г. ЗАГОРСКАЯ.